Наш культурны асяродак
# Жырандоля
Выпуск № 37 (337)



■ Кінакрокі

# ШТО НАМ ПАКІНУЎ АНДЖЭЙ ВАЙДА?

## Той, хто на экране адлюстроўвае эпоху, сам становіцца эпохай

**Больш за сорак фільмаў, створаных за шэсцьдзясят гадоў працы. Смерць знакамітага польскага рэжысёра — гэта сыход тытана. Яго карціны трымаюць сусветны кінематограф, як тыя дванаццаць багоў — неба на сваіх плячах. Сапраўдны класік кіно — творца, мэтр, бог. Усяму свету ён шчыра, прыгожа, метафарычна расказваў пра Польшчу — пра часы вайны, пра Варшаўскае паўстанне супраць гітлераўскіх акупантаў у 1944 годзе, пра антыкамуністычнае Супраціўленне, жыццё рабочага класа, пра расслаенне грамадства напрыканцы стагоддзя. 9 кастрычніка рэжысёр пайшоў з жыцця ва ўзросце дзевяноста гадоў, на наступным тыдні — 19 кастрычніка — у Кракаве адбудзецца пахаванне. Класік сышоў — класіка засталася.**

«Польшча была яго страсцю», — сказаў рэжысёр і кіраўнік Саюза польскіх кінематаграфістаў Яцэк Бромскі польскаму тэлебачанню. Заставалася страсцю, калі была залежнай, калі стала самастойнай, калі яе дзялілі, калі яе акупавалі, калі польская нацыянальная самасвядомасць цярпела прыніжэнне і калі ўздымала галаву. Радзіма прысутнічае ў кожным фільме Вайды — як у карцінах кшталту «Катыні», якую зняць аказалася магчымым толькі пасля 1989 года, так і ў экранізацыях рускай прозы — «Сібірская лэдзі Макбет» паводле Мікалая Ляскова, «Бесы» паводле Фёдара Дастаеўскага, «Пілат і іншыя» паводле Міхаіла Булгакава. Фільмы Анджэя Вайды адзначаны ўзнагародамі Канскага, Венецыянскага, Берлінскага кінафестываляў, адзнакамі Брытанскай кінаакадэміі, Сезарам, чатыры разы творы рэжысёра намінаваліся на Оскар у катэгорыі «Найлепшы фільм на замежнай мове». Апошнюю карціну Вайды «Паслявобразы» польская оскараўская камісія таксама прадставіла на суісканне прэміі.



**Ён нарадзіўся ў сям'і настаўніцы і ваеннага, што, вядома ж, значыла пераезды, уражанні ад воінскіх рытуалаў... У 1939 годзе бацьку забралі ў палон і расстралялі ў Катыні.**

А пачалося ўсё ў 1954 годзе з фільма «Пакаленне» — першай поўнаметражнай карціны Анджэя Вайды (у якой, дарэчы, зняліся Раман Паланскі і Збігнеў Цыбульскі). Хоць дакладней, канешне ж, усё пачалося з цяжкага, гаротнага, крывавага доследу, які праціная ўсю фільмаграфію рэжысёра. Ён нарадзіўся ў сям'і настаўніцы і ваеннага, што, вядома ж, значыла пераезды, уражанні ад воінскіх рытуалаў і датычнасць да Арміі Краёвай, якой пазней — падчас вайны — Вайда прынясе прысягу. У 1939 годзе бацьку забралі ў палон і расстралялі ў Катыні. «Ён пайшоў на вайну і не вярнуўся. Маці больш не магла заставацца дома і павінна была працаваць, мы сталі работнікамі. З інтэлігентнай сям'і апынуліся ў зусім іншым асяродзі». Яму было 13 гадоў, калі пачалася вайна, хутка ўжо не было магчымасці вучыцца, заставалася толькі працаваць. «Гэта дапамагло мне зразумець, што значыць фізічная праца, што значыць працаваць кожны дзень, пачынаючы з ранку, і калі ў 50-я гады казалі пра рабочы клас, я адказваў сабе, што «таксама быў чорнарабочым». Тут для мяне не было нічога незразумелага».



Кадр з фільма «Попел і дыямент».

Падумаць толькі, але Анджэй Вайда апроч іншага дапамагаў рэстаўраваць храмы — гэта рабілася ў ваенны час! Ужо ў 1946 годзе будучы рэжысёр паступіў у Акадэмію мастацтваў у Кракаве. Напэўна, адсюль у яго фільмах з'явіліся вобразы творчай інтэлігенцыі ва ўмовах вайны. «Яны, нашы прафесары, адважыліся пісаць падчас вайны эцюды, пейзажы і нацюрморты. І гэта было нейкае супраціўленне... гэтай вайне, усяму таму, што несла нацысцкая акупацыя ў Польшчы». Ужо ў карціне «Канал» сярод групы байцоў Арміі Краёвай, што адступае па каналізацыйных каналах падчас паўстання 1944 года ў Варшаве, быў музыкант. У разбураным доме ён іграў на разладжаным піяніна і глядзеў у пустэчу затуманенымі вачыма. Дарэчы, менавіта фільм «Канал» заявіў пра польскага рэжысёра Анджэя Вайду ўсяму свету.

Але гэта было пасля таго, як той вырашыў, што кінамастацтва больш адпавядае патрабаванням і стылю пасляваеннага часу і, не скончыўшы Акадэміі мастацтваў, пайшоў вучыцца ў вышэйшую кіношколу ў Лодзі. «Прафесар Ежы Цяпліца — наш рэктар — прывёз з Парыжа калекцыю авангардных французскіх фільмаў, не савецкага авангарда, не Эйзенштэйна, а менавіта французскага. Я паглядзеў «Механічны балет», «Андалузскага сабаку», «Залаты век», і зноў «Механічны балет». Усе гэтыя фільмы адкрылі мне вочы на зусім іншае кіно. У нас такое кіно не толькі ніколі не стваралася, мы такога нават не бачылі».

**«Гэта дапамагло мне зразумець, што значыць фізічная праца, што значыць працаваць кожны дзень, пачынаючы з ранку, і калі ў 50-я гады казалі пра рабочы клас, я адказваў сабе, што «таксама быў чорнарабочым».**

Разам з Анджэем Мункам, Ежы Кавалевічам, Войцахам Хасам Анджэй Вайда стварыў «новую польскую школу». Карціна «Попел і дыямент», знятая ў 1958 годзе, завяршыла ваенную трылогію і неаспрэчна стала адной з найважнейшых карцін сусветнага кінематографа. Яна ж прадставіла гледачу крыўдны дысананс — паміж трыумфам перамогі, шчасцем канца Другой сусветнай вайны і ўнутранай грамадскай барацьбой у Польшчы. Галоўны герой баец Супраціўлення Мацэк, якога сыграў Збігнеў Цыбульскі, забівае высокапастаўленага камуніста Шчуку — калі той памірае на цёмнай бязлюднай гарадской вуліцы, у горадзе пачынаецца святочны салют. Апошняя сцэна такім жа чынам — іншасказальным — паказала, што Польшча стала, як кажуць, «савецкай» тэрыторыяй. Неверагодна тонкі, прыгожы, трагічны фільм.

Рэжысёр, што адной з найвышэйшых каштоўнасцяў, здаецца, лічыў свабоду, крытык сталінізму, прынцыповы творца і чалавек, актыўны грамадскі дзеяч. У часы цэнзуры ён выказваўся праз тонкія, трапныя, нават выбухныя метафары. «Даволі хутка я зразумеў, што лепш быць незалежным чалавекам, што няпраўда, быццам партыйны творца мае большыя магчымасці, бо партыя дазваляе яму зрабіць фільм і розныя рэчы, якія іншым рабіць быццам нельга — якраз наадварот. Партыя кантралявала сваіх членаў. Звала іх і казала: «Ці ведаеце, ці разумееце, чаму дзейнічаеце такім чынам? Чаму вы не трымаецеся партыйнай лініі?» А мне нельга было такога сказаць, таму што я не трымаўся гэтай лініі. Я быў чалавекам, які здымаў фільмы. Я не далучыўся да партыі не толькі таму, што мой бацька не далучыўся б, што мая маці палічыла б гэта недарэчным, проста ўжо пачынаў мець свой уласны розум».

**Карціна «Попел і дыямент», знятая ў 1958 годзе, завяршыла ваенную трылогію і неаспрэчна стала адной з найважнейшых карцін сусветнага кінематографа. Яна ж прадставіла гледачу крыўдны дысананс — паміж трыумфам перамогі, шчасцем канца Другой сусветнай вайны і ўнутранай грамадскай барацьбой у Польшчы.**



Кадр з «Катыні».

Вядома, не ўся творчасць Анджэя Вайды аддадзена на палітычную злабадзённасць, хоць чалавеку, які нарадзіўся ў 1920-я гады, было што сказаць — ён здымаў і лірычныя, сатырычна-камедыйныя карціны. Апроч стужкі «Попел і дыямент», што нязменна застаецца ў разнастайных спісах найлепшых фільмаў свету, вядомыя «Чалавек з мармуру» і «Чалавек з жалеза», «Попел», «Пейзаж пасля бітвы», «Дзяўчынка ніхто», «Катынь».

Дакументалізм у адлюстраванні вайны, метафарычная кінамова, бясконцая любоў да сваёй краіны, тонкія назіранні за чалавекам, увесь цяжар ваеннага і пасляваеннага жыцця ў Польшчы, шэраг адкрытых рэжысёрам выдатных акцёраў, герой Збігнева Цыбульскага, што ноччу ў разбураным храме сумняваецца ў сваім шляху, не зважаючы на перавернутае распяцце — тое, што засталося нам ад Анджэя Вайды. І застанецца з намі.

Ірэна КАЦЯЛОВІЧ. katsyalovich@zviazda.by

■ Змахнуць пыл часу

# Бібліятэка будучыні: не проста склад для кніг

**Сёлета Фундаментальная бібліятэка БДУ адзначае 95-годдзе. Гэта свята стала добрай нагодай абмеркаваць магчымасці работы ў сучаснай інфармацыйнай прасторы і пераняць вопыт іншых краін. Супрацоўнікі бібліятэк ЗША, Францыі, Германіі, Польшчы і Казахстана сабраліся, каб расказаць, якой бачаць сваю працу ў будучыні.**

— Сёння нашы выступленні — усяго толькі позірк у будучыню. Але спадзяюся, што праз два гады я змагу расказаць вам пра вынікі праекта, а яны падаюцца мне аптымістычнымі. Перад бібліятэкамі ўзнікае дылема: альбо працягваць жыццё па старой мадэлі і не звяртаць увагі на змены, што адбываюцца навокал, альбо спрабаваць змяняцца разам з наваколлем, каб не згубіць сваё месца ў ім, — выказаў адну з асноўных думак сустрэчы **дырэктар Універсітэцкай бібліятэкі Берлінскага ўніверсітэта імя Гумбальта, доктар навук, прафесар Андрэас ДЗЕГКВІЦ.**

**Дырэктар Фундаментальнай бібліятэкі БДУ Уладзімір КУЛАЖАНКА** таксама згодны з калегамі, што сучасная ўніверсітэцкая бібліятэка — гэта найбольш тэхнічна і інфармацыйна развітое падраздзяленне ва ўсёй установе вышэйшай адукацыі:

— Будучыня — гэта трансфармацыя ў інфармацыйна-бібліятэчны цэнтр, вузел, які не толькі прадстаўляе матэрыяльныя і электронныя рэсурсы для вялікага кола карыстальнікаў, але і дапамагае навукоўцам. Як напісаць артыкул? Як прасунуць яго ў паўны часопіс ці базу даных? Гэта ўсё павінна даваць бібліятэка. Лічу, што такая кансультацыйная падтрымка навукі стане асноўнай нашай задачай. Акрамя таго, не трэба скідваць з рахункаў і выхаваўчую, культурную дзейнасць і непасрэднае прызначэнне любой універсітэцкай бібліятэкі — забеспячэнне матэрыяламі вучэбнага працэсу. Аднак прайшлі часы, калі мы былі толькі месцам, дзе студэнтам выдавалі падручнікі. Цяпер БДУ можа пахваліцца ўласнай электроннай бібліятэкай, сёння там у свабодным доступе захоўваецца больш за 100 тысяч лічбавых дакументаў. У міжнародных рэйтынгах па Цэнтральнай і Усходняй Еўропе мы займаем лідзіручыя пазіцыі, і нават траплялі ў спіс сотні лепшых электронных бібліятэк свету. Акрамя таго, на нашай базе працуюць лабараторыя тэхнічнай творчасці, студэнцкія клубы, метадычны і каардынацыйны цэнтр для бібліятэк устаноў вышэйшай адукацыі Беларусі.

Сустрэча, на якой прысутнічалі прадстаўнікі ўніверсітэцкіх, публічных і дзяржаўных бібліятэк Беларусі, а таксама дэлегацый з Расіі, Украіны, Азербайджана, Камеруна, Нігерыі, адбылася падчас XVI Міжнароднай навукова-практычнай канферэнцыі «Менеджмент бібліятэк ВНУ», якая праходзіла ў рамках IV Кангрэса «Бібліятэка як феномен культуры».

Рагнеда ЮРГЕЛЬ. yurgel@zviazda.by